ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
20
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 3 (1379)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### *ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ*

работы факультэтаў па інтэрнацыянальнаму выхаванню студэнтаў. Першае месца прысуджана гістарычнаму факультэту (адказны за інтэрработу В. Шадурскі), другое — ФПМ (адказны А. Канаш), трэцяе — мехмату (адказны А. Загранюк). Не на высокім узроўні вядзецца інтэрработа на юрыдычным і хімічным факультэтах, факультэтах радыёфізікі і электронікі, журналістыкі, якія занялі апошнія месцы.

**С. ПЛЫТКЕВІЧ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

### *СХОД АСПІРАНТАЎ*

з Алжыра, што вучацца ў БДУ імя У. І. Леніна, адбыўся ў інтэрнаце № 2. На ім заслуханы паведамленні аб выкананні індывідуальных планаў аспірантамі, якія будуць абараняцца ў гэтым годзе. На сходзе прысутнічалі куратары зямляцтва.

**У. БУДАЙ,**
**кіраўнік інтэрпрэс-цэнтра.**

### *НА ПАСЯДЖЭННІ*

арганізацыйна-масавай камісіі студэнцкага прафкома падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж прафсаюзнымі арганізацыямі універсітэта за мінулы год. Лепшымі сярод факультэтаў прызнаны ФПМ, на другім месцы — мехмат, на трэцім — гістфак.

**Н. ТУРОМША,**
**намеснік старшыні прафкома.**

### *КАМІСІЯ*

прафкома універсітэта падвяла вынікі конкурсу на лепшае афармленне ленінскіх пакояў, у якім прынялі ўдзел усе факультэты. Першае месца прысуджана гістарычнаму факультэту, на другім ФПМ і філфак, трэцяе месца падзялілі механіка-матэматычны і геаграфічны факультэты.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

### *ПРАЙШЛО*

першынство універсітэта па класічнай барацьбе. Напружанымі былі сустрэчы паміж лепшымі барцамі факультэтаў. Але перамаглі мацнейшыя. На першае месца выйшла каманда геаграфічнага факультэта, другімі былі юрысты, на трэцім месцы — фізікі.

У шасцёрку мацнейшых увайшлі таксама ФПМ (IV), хімфак (V), факультэт радыёфізікі і электронікі (VI).

**В. РУДЗЯНКОЎ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**



# Па універсітэту крочыць сесія

ФОТАРЭПАРТАЖ

*ЗДАДЗЕНЫ ЗАЛІКІ, на ўсіх факультэтах прайшлі першыя экзамены. Наш карэспандэнт пабываў у гэтыя дні ў філолагаў.*

*НА ЗДЫМКАХ: экзамен па беларускай мове здаюць другакурснікі рускага аддзялення. Дацэнт кафедры беларускай мовы Мікалай Дзмітрыевіч Міхей і студэнтка Вольга Пяткевіч могуць быць задаволены. Прыемна атрымаць залікоўку, дзе першая адзнака — пяцёрка. А за дзвярыма ў апошнія мінуты гартаюцца падручнікі, канспекты. Сесія працягваецца...*

*Фота В. ШАЧАКА.*







## РАСКАЖУ АБ ГРУПЕ

### «Справы ў нас агульныя»

ШОСТАЯ ГРУПА другога курса — адна з лепшых на юрыдычным факультэце. У мінулым годзе яна выйшла пераможцай у сацыялістычным спаборніцтве сярод груп факультэта і была ўзнагароджана паездкай у Вільнюс.

Калі яны паступілі на факультэт, то мала хто спадзяваўся, што ў іх атрымаецца добрая група. Але ішоў час. Першую сесію здалі даволі паспяхова і падзялілі I—II месцы сярод груп юрфака. А па адзнаках летняй сесіі былі першымі.

— Як вам удалося дасягнуць гэтых поспехаў? Можа група ваша якая незвычайная? — пытаюся ў намесніка старшыні прафбюро факультэта, студэнта гэтай жа групы Уладзіміра Камовіча.

— Ды не, — адказвае Уладзімір, — самая звычайная акадэмічная група: 18 хлопцаў і 10 дзяўчат. Толькі кожны з нас добра разумее сваю задачу і выконвае яе з поўнай адказнасцю.

Але вучоба — гэта адзін бок студэнцкага жыцця. Шостая група не застаецца ў баку і ад грамадскай работы. Тры камсамольцы— члены прафбюро юрфака, адзін — член камітэта камсамола. На базе групы створаны аператыўны атрад факультэта. Многія студэнты ўдзельнічаюць ва універсітэцкіх спартыўных спаборніцтвах па футболу, валейболу, баскетболу, шахматах. Трэці працоўны семестр група правяла ў будаўнічых атрадах.

— Наша група вельмі дружная, — гаворыць Уладзімір Камовіч.— У гэтым, на мой погляд, і сакрэт нашых поспехаў. Усе справы ў нас агульныя.

**Н. КІРБАЦКАЯ,**
**член прэс-цэнтра прафкома.**

### «ВУЧЫМСЯ СУМЛЕННА»

НАША ГРУПА ў сваім цяперашнім саставе існуе ўсяго другі год. Гэта не такі вялікі тэрмін, каб добра пазнаць сваіх таварышаў. Але ўжо зараз можна сказаць, што сабраліся ў нас людзі захопленыя, неспакойныя.

Вядома, што галоўнае для нас зараз — вучоба. Вучыцца сумленна, з поўнай аддачай сіл, ужо ў студэнцкія гады прыносіць карысць грамадству — такая грамадзянская пазіцыя ў кожнага з нас.

Аб адносінах да вучобы ў нашай групе красамоўна гаворыць той факт, што другую сесію запар у нас няма двоек, паменшылася колькасць здавальняючых адзнак, сярэдні бал вырас з 4,25 да 4,5. Трэба адзначыць, што вялікая заслуга ў гэтым акадэмічнага сектара групы (адказная Людміла Грынаш), які добра наладзіў кантроль за паспяховасцю, дапамогу адстаючым.

Акрамя вучобы, студэнты нашай групы актыўна ўдзельнічаюць у грамадскай рабоце. Многія — члены студэнцкага навуковага таварыства. Дарэчы, узначальвае яго таксама студэнт нашай групы Алег Таўгень, ленінскі стыпендыят, чалавек, на якога раўняюцца ўсе.

А Лілі Паляковай, Іры Бражыцкай, Леры Каралёвай даручана арганізацыя палітычнай атэстацыі ў падшэфнай групе ГПТУ-114. І спраўляюцца дзяўчаты з гэтым абавязкам паспяхова.

Мы можам не толькі паспяхова вучыцца, але і добра адпачываць. Пасля заняткаў часта наведваем музеі, выстаўкі, тэатры, праводзім «агеньчыкі». Такія мерапрыемствы ўзбагачаюць духоўна, збліжаюць студэнтаў, дапамагаюць зразумець адзін аднаго.

**Л. БАРЫСАВА,**
**А. ФЕДАРОВІЧ,**
**студэнткі 6-й групы 4-га курса механіка-матэматычнага факультэта.**

### ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА

### АДКАЗНАЕ ВЫПРАБАВАННЕ

У АКТАВАЙ ЗАЛЕ філалагічнага факультэта сабраліся студэнты IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры, каб падвесці вынікі педагагічнай практыкі.

Кіраўнік педпрактыкі Зінаіда Браніславаўна Варановіч адзначыла, што сваё адказнае выпрабаванне студэнты-філолагі вытрымалі паспяхова. З 89 практыкантаў 81 атрымаў адзнаку «выдатна», а 8 — «добра». Усе студэнты сур'ёзна і зацікаўлена аднесліся да падрыхтоўкі і правядзення ўрокаў і выхаваўчых мерапрыемстваў.

Шчыра, крышачку ўсхвалявана дзяліліся студэнты сваімі ўражаннямі, сваім маленькім настаўніцкім вопытам.

Практыка дала многае, але яшчэ больш паставіла пытанняў, на якія патрэбна адказаць у час будучай вучобы. Каб, пайшоўшы ў школу, мы змаглі перадаць дзецям усё тое, што зберaглі ў сваіх сэрцах.

**Л. СЯРМЯЖКА,**
**студэнтка філалагічнага факультэта.**

У лістападзе мінулага года газета надрукавала артыкул Н. КАЛІШЭВІЧ «Хто, калі не я?», у якім ішла размова пра безыніцыятыўнасць, пасіўнасць пэўнай часткі студэнцтва. У ходзе абмеркавання матэрыялу ўзнік цэлы шэраг пытанняў, з якімі аўтар звярнулася да сакратароў камсамольскіх арганізацый некаторых факультэтаў універсітэта.

Каго лічыць актывістам? Што такое «актыўная жыццёвая пазіцыя»? Як разбудзіць «пасіў»? Вось тэмы размовы, якая сёння прапануецца чытачам.

У гутарцы прымаюць удзел: ВОЛЬГА ЖУК — сакратар камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта; АЛЯКСАНДР КАРАНЬКО — сакратар камітэта камсамола фізічнага факультэта; ТАМАРА ГРЫБКО — сакратар камітэта камсамола гістарычнага факультэта; ЛЁДЗІЙ ЛЫСЁНАК — сакратар камітэта камсамола геаграфічнага факультэта; ЛЮДМІЛА ПАНЧАНКА — сакратар камітэта камсамола факультэта прыкладной матэматыкі.

# Грані актыўнасці

**А. КАРАНЬКО:** — На мой погляд, праблемы, узнятыя ў артыкуле, не з'яўляюцца першаасновай, яны хутчэй вынік. А вось пра першапрычыну мы часта забываем. Пачынаць трэба з пачатку. Возьмем Статут ВЛКСМ. Раздзел першы, пункт чацвёрты: «Членам ВЛКСМ можа быць любы малады чалавек Савецкай краіны, які прызнае Статут ВЛКСМ, актыўна ўдзельнічае ў будаўніцтве камунізму, працуе ў адной з камсамольскіх арганізацый, выконвае рашэнні камсамола і плоціць членскія ўзносы». У гэтым і сутнасць. У нас большая частка моладзі — камсамольцы. Пра якое павышэнне актыўнасці можна гаварыць, калі размова ідзе пра звычайнае выкананне Статута ВЛКСМ. Вось на гэта, у першую чаргу, павінны быць накіраваны намаганні камітэта камсамола.

Студэнты ВНУ — гэта дарослыя людзі, якія прыходзяць на першы курс з ужо сфарміраванымі поглядамі на свет. А ў нас адносіны да іх пакуль што «школьныя». Дзеці, маўляў, яшчэ. І пачынаецца тлумачальная работа на тэму «Што такое добра і што такое дрэнна». Яны бачаць такія адносіны да сябе і... прывыкаюць, забываюць пра самастойнасць. Яны пачынаюць адчуваць, што калі ўсе навокал думаюць толькі пра тое, каб іх зацікавіць, уцягнуць у якую-небудзь карысную справу, дык у гэтай сітуацыі можна дазволіць сабе і заўвагу зрабіць. Такую, напрыклад: «Дрэнна неяк вечар (сход, суботнік, мітынг...) прайшоў. Не, не ўмеюць у нас вечары праводзіць». У такіх выпадках мне заўсёды хочацца спытаць у крытыкана: «А што вы, паважаны, умееце?..»

**Л. ЛЫСЁНАК:** — На маю думку, трэба больш увагі ўдзяляць выхаванню і вучобе іменна студэнцкага актыву. Бо калі актывіст не адчувае сапраўднай падтрымкі і дапамогі, ён паступова губляе сваю актыўнасць. Я лічу, што ёсць людзі, якія выконваюць свае грамадскія даручэнні толькі пад націскам, іх нельга лічыць актыўнымі, нават калі яны і зробяць даручанае. Люблю тых, каму, як кажуць, да ўсяго ёсць справа. Быў у маёй практыцы такі выпадак: праводзіліся апошнія ўдакладненні саставаў сельскагаспадарчых атрадаў. Вядома, тыя, хто летам працаваў у СБА, на «бульбу» не едуць, у іх канікулы. Напярэдадні ад'езду прыйшлі ў камітэт камсамола будатрадаўцы: Жэня Шыманскі, Андрэй Андрэеў, Саша Галубцоў, Эдзік Шпаржовіч, Юра Цвірко. «Хочам, — кажуць, — на «бульбу» паехаць!» Я здзівіўся: «Вы ж адпачываць павінны». «Вось там і папрацуем, і адпачнем». Прызнаюся, прыемна было такі адказ пачуць.

**КАРЭСПАНДЭНТ: — Мы часта і, бадай, занадта прывычна вымаўляем: актыўнасць, актыўная жыццёвая пазіцыя... Што стаіць за гэтымі словамі? У чым яна, актыўнасць, канкрэтна праяўляецца?**

**Л. ПАНЧАНКА:** — Мы гаворым: «Ён займае актыўную жыццёвую пазіцыю». Каго мы так характарызуем? Перш за ўсё тых, хто імкнецца набыць рознабаковыя і трывалыя веды, каго многае цікавіць, хто не замыкаецца ў вузкім коле будзённасці. Але... Ці не прывядзе такое прывычнае тлумачэнне да таго, што ў лік актывістаў мы занясем і тых «пасіўных эрудытаў», якія таксама многа ведаюць, у курсе кінематаграфічна - тэатральна - літаратурных навінак, лёгка разважаюць аб самых складаных пытаннях, маюць моднае хобі? Хто скажа, што няма ў іх талентаў, здольнасцей? Ёсць. Для сябе. Актывіст — не сузіральнік, наадварот — стваральнік. Ён жыве для людзей і разам з людзьмі. Прыкладам сапраўднай актыўнай жыццёвай пазіцыі для мяне і членаў камітэта камсамола ФПМ з'яўляецца жыццё Аляксандра Васільевіча Яраксіна. Яго партыйны стаж налічвае ўжо больш за 50 гадоў. Па ўзросту Аляксандр Васільевіч мае заслужанае права на адпачынак, але ён не можа бяздзейнічаць. Зараз яго часта можна ўбачыць сярод моладзі, ён цікавіцца камсамольскімі справамі, заўсёды дасць добрую параду, дапаможа ў складанай сітуацыі. Аляксандр Васільевіч прывык жыць актыўна. Другім ён сябе не ўяўляе.

**Т. ГРЫБКО:** — Меркаваць аб тым, якую пазіцыю займае чалавек, нельга толькі па грамадскай рабоце: удзел у ёй — гэта адно з нямногіх праяўленняў актыўнай жыццёвай пазіцыі. Нельга ставіць знак роўнасці паміж грамадскай работай і актыўнасцю. Актыўная жыццёвая пазіцыя праяўляецца не эпізадычна, а выпрацоўваецца гадамі. Ад самога чалавека залежыць, наколькі верным застанецца ён сваім прынцыпам, ці здолее справай даказаць свае перакананні.

**КАРЭСПАНДЭНТ: — Што, па-вашаму, трэба зрабіць для таго, каб павысіць усеагульную (без дзялення на «актыў» і «пасіў») студэнцкую актыўнасць?**

**Л. ЛЫСЁНАК.** — Старыя формы і метады работы з моладдзю ўжо не даюць патрэбных рэзультатаў. Цяпер неабходны пошук якасна новых рашэнняў, карпатлівая работа з кожным камсамольцам, арганізацыя справы з ўлікам індывідуальных запытаў і інтарэсаў маладых людзей.

У сваёй рабоце мы дабіваемся канкрэтнай рэалізацыі складзеных планаў, адказных адносін да справы. Работа



камітэта камсамола вядзецца ў групах, за кожнай з якіх замацаваны куратар ад камітэта камсамола. Ён дапамагае арганізаваць і актывізаваць дзейнасць первічных арганізацый. Мы падтрымліваем цікавыя ініцыятывы. Напрыклад, на сродкі, заробленыя на суботніках, сельгасработах, была арганізавана дыскатэка. Цяпер ствараем у інтэрнаце № 7 клуб па інтарэсах. Пакуль што ў ім невялікая група энтузіястаў, але яны ўпэўнены, што з цягам часу ў клубе будуць арганізаваны разнастайныя секцыі, дзе кожны знойдзе для сябе цікавую справу.

**В. ЖУК:** — Сапраўды, цікавыя справы «адкрываюць» цікавых людзей, якім ёсць дзе праявіць сваю ініцыятыву. Мне ўспамінаецца лета 1978 года. Першы ў Беларусі студэнцкі камуністычны будаўнічы атрад. Яго камандзіру Аляксандру Казуліну, усім байцам трэба было прыкласці нямала сіл, каб даказаць не толькі на словах, але і на справе неабходнасць стварэння такога атрада. Мемарыяльны знак на месцы гібелі Героя Савецкага Саюза А. Матросава, узведзены байцамі будатрада, — лепшы доказ таго, што поспехаў дабіваюцца актыўным дзеяннем, асабістай перакананасцю.

**Т. ГРЫБКО:** — Мяне хвалюе пазіцыя некаторых камсамольцаў. Маўляў, цябе абралі камсоргам, ты і думай, чым нас зацікавіць. Безумоўна, многае залежыць ад камсамольскага актыву, яго падрыхтатаванасці, але калі ўсе намаганні актыву сустракаюцца з абыякавасцю, нежаданнем асноўнай масы рабіць што-небудзь? Як тут быць? Хто вінаваты? Адказы на гэтыя пытанні могуць быць самымі разнастайнымі, але мне здаецца, што кожнаму з нас трэба ўносіць свой канкрэтны ўклад у барацьбу з бяздзейнасцю, шэрасцю, беспрынцыповасцю. І не толькі прыгожымі словамі — эфектыўнымі справамі.

**КАРЭСПАНДЭНТ: — Усё часцей даводзіцца чуць, што камсамольскую работу неабходна «ажыўляць», уносіць у яе свежы струмень, ачышчаць ад налёту фармалізму. Што вы думаеце аб гэтым?**

**Л. ЛЫСЁНАК:** — Першае, што трэба зрабіць, гэта павысіць патрабавальнасць. І ў першую чаргу — да камсамольскага актыву, да сябе. Не пабаяцца лішні раз спытаць: «А ці ўсё я зрабіў для таго, каб камсамольскае жыццё стала неабходным і цікавым для кожнага?» Другое — прынцыповы падыход да дзейнасці саміх камсамольцаў, не пакідаць іх без дапамогі, але і не няньчыцца, як у дзіцячым садзе.

**А. КАРАНЬКО:** — Кантроль за выкананнем сваіх абавязкаў камсамольскім актывам і строгая патрабавальнасць да так званага «пасіву».

**Т. ГРЫБКО:** — Трэба проста ведаць: усё залежыць ад нас саміх.

● НЕЧАКАНЫ ВОДГУК

# «Навошта мне гэта патрэбна?»

КАБ РАССТАВІЦЬ ўсе кропкі над «і», скажу адразу: «Я з тых, хто свядома адносіць сябе да «пасіву». Падкрэсліваю — свядома. Быць актывістам мне не цікава і не зручна. Навошта мне гэта патрэбна?! Каб вылучыцца? Зрабіць кар'еру? Стаць вядомым, няхай толькі ў вузкіх факультэцкіх колах? На-во-шта? Мой пункт гледжання такі: ВНУ павінна даваць веды. А выхоўваць хопіць. Навыхоўвалі ўжо з дзіцячага сада і да апошняга школьнага дня. І як не разумець простую ісціну: студэнты — людзі дарослыя. Мы маем свой погляд на свет, свае прывычкі і жаданні. Хопіць навязваць нам нейкія шаблонныя паводзіны, не трэба агульна ахопліваць даручэннямі, ці варта ўцягваць кожнага ў грамадскую работу?

Так, я імкнуся асабліва не вылучацца. Але гэта зусім не значыць, што я — чалавек нудны. І мне, і са мной многім цікава. Але не ў сценах універсітэта і не камсамольскім лідэрам. Я лічу іх людзьмі няшчырымі. Вы пішаце пра фармалізм і нуду ў студэнцкім жыцці. Ну як ім не быць, калі многія так захапіліся паперкамі, што гэтая «папяровая завіруха» ўрэшце прымусіла іх упэўніцца ў нейкай асабістай важнасці і бязгрэшнасці. Няхай сабе цешацца. «Не рвусь я грудью в капитаны и не ползу в ассесора...». Толькі б мяне не чапалі і не прымушалі рабіць тое, чаму я не веру і да чаго не адчуваю ніякага прызвання. Я хачу застацца «серадняčком», «шэрай асобай», як называюць мяне «звышактывізаваныя» прадстаўнікі студэнцтва.

Можа быць, хто-небудзь успомніць, што я камсамолец? Так, камсамолец. І плачу членскія ўзносы. Здаецца, больш ад мяне камсамолу нічога не патрэбна. Ва ўсякім выпадку пакуль што патрэбным я сябе не адчуў. Не лічыць жа сапраўднай справай абавязковы ўдзел у тых арганізаваных мерапрыемствах, якія нехта сур'ёзна называе неабходнымі?

Я — за свабодны выбар сваёй жыццёвай пазіцыі. Не трэба ўсім актыўна хадзіць па накрэсленай кімсьці лініі, не трэба заклікаць да бурнай дзейнасці, накіраванай у нікуды...

**Н. К., студэнт.**

**(Падрабязных даных не пішу, бо баюся, знойдзецца які-небудзь «актывіст», якому вельмі захочацца мяне перавыхаваць).**

**АД РЭДАКЦЫІ: Вось такое «калючае» пісьмо атрымала рэдакцыя. Доўга абмяркоўвалі, спрачаліся: змяшчаць ці не? Вырашылі — надрукаваць. Дзеля таго, каб былі выказаны ўсе пункты гледжання на абмяркоўваемую праблему. Мы упэўнены, што нашы чытачы змогуць аб'ектыўна і аргументавана адказаць на «праграму пазіцыі» студэнта Н. К.**

# ШТО Ў НАБЫТКУ?

## ШКОЛА МАЛАДОГА ЛЕКТАРА

**«СЛОВА ТАКСАМА ЁСЦЬ СПРАВА», — адзначаў У. І. Ленін. У нашы дні, калі адной з першарадных задач з'яўляецца далейшае паляпшэнне ідэалагічнай работы, больш чым калі актуальна ленінскае палажэнне аб адзінстве слова і справы.**

Калектывам нашага універсітэта вядзецца вялікая мэтанакіраваная работа па прапагандзе марксізму-ленінізму, рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда КПБ, рашэнняў майскага і лістападаўскага (1982 г.) Пленумаў ЦК КПСС. Нашы лепшыя лектары А. А. Галаўко, І. І. Жбанкова, Т. І. Прыцьцкая, А. А. Круглоў, П. М. Савасцёнак і многія іншыя прымаюць актыўны ўдзел у рабоце лектарскіх груп ЦК, абкома і гаркома партыі, у правядзенні навукова-практычных канферэнцый у розных гарадах і раёнах рэспублікі.

Імкнучыся паўней задаволіць патрэбы і інтарэсы слухачоў, універсітэцкая арганізацыя таварыства «Веды» шырока выкарыстоўвае розныя формы прапаганды: цыклы лекцый, лекторыі, грамадска-палітычныя чытанні і г. д.

Удасканальваюцца змест, формы і метады заняткаў у народных універсітэтах БДУ імя У. І. Леніна: «Прававых ведаў» (на базе юрыдычнага факультэта), «Прыроды» (на біялагічным факультэце), «Маральнага выхавання» (у вытворчым аб'яднанні «Гарызонт» пад кіраўніцтвам лектараў — выкладчыкаў кафедраў этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, навуковага камунізму).

Нашы вопытныя і найбольш падрыхтаваныя маладыя лектары вядуць актыўную лекцыйна-прапагандысцкую работу сярод навучэнцаў, у тым ліку ў 11 школах: «Юнага матэматыка», «Юнага фізіка», «Юнага хіміка», «Юнага гісторыка» і г. д. Што датычыць лекцыйнай работы унутры свайго калектыву, то для студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў сіламі нашых лектараў толькі па матэрыялах партыйных з'ездаў кожны год чытаецца звыш 500 лекцый, дакладаў. На кожным факультэце арганізаваны цыклы лекцый «Ад з'езда да з'езда — ленінскім курсам». Для замежных студэнтаў чытаюцца цыклы «Знешняя і ўнутраная палітыка КПСС», «Рэспубліка, у якой ты жывеш».

Зразумела, тэматычная накіраванасць, якасць і эфектыўнасць лекцыйнай прапаганды залежаць перш за ўсё ад саставу лектарскіх кадраў. Ва універсітэце склалася стройная сістэма іх вучобы і павышэння кваліфікацыі.

Асобай увагі заслугоўвае паляпшэнне работы школы маладога лектара (ШМЛ), прыцягненне яе выпускнікоў і слухачоў да актыўнай лектарскай практыкі, прычым не толькі ў ВНУ, але і па-за ёй, бо любая творчая справа немагчыма без пастаяннага прытоку маладых сіл. Вось чаму падрыхтоўка лектараў, прапагандыстаў, агітатараў, палітінфарматараў — праблема вельмі важная і актуальная.

Сёння мы ўжо можам гаварыць аб пэўным вопыце работы ў падрыхтоўцы маладых лектарскіх кадраў у нашай школе маладога лектара. Калі ў 1975 годзе школа налічвала 55 чалавек (у асноўным гэта былі студэнты гістарычнага і філалагічнага факультэтаў), то ў 1980 годзе ў школе займалася 228 чалавек, якія прадстаўлялі ўсе 11 факультэтаў універсітэта. У гэтым годзе пачынаючыя лектары атрымалі магчымасць спецыялізавацца ў адной з 9 міжфакультэцкіх секцый: «Лектараў-міжнароднікаў» (курыруе кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў); «Гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага дэмакратычнага маладзёжнага руху» (кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў); «Філасофскіх ведаў» (кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі); «Эканамічных ведаў» (кафедра палітэканоміі); «Прававых ведаў» (кафедра крыміналістыкі); «Навуковага атэізму» і «Этыкі і маральнага выхавання» (кафедра этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму); «Аховы акружаючага асяроддзя» (кафедра фізічнай геаграфіі СССР); «Праблем ідэалагічнай барацьбы і палітычнага выкрывання імперыялізму» (кафедра навуковага камунізму).

Стала больш удасканаленай методыка навучання слухачоў лекцыйна-прапагандысцкай рабоце. Распрацаваны і апублікаваны тыпавыя прыкладныя палажэнні аб ШМЛ і прыкладная вучэбная праграма па курсу лектарскага майстэрства. Цікава і змястоўна чытаюць лекцыі для слухачоў школы нашы лектары-метадысты М. Б. Яфімава, В. Ф. Беркаў, Р. І. Вадэйка, В. І. Гамаў, М. Г. Насеннік, а таксама лектары з іншых ВНУ, работнікі партыйных і савецкіх органаў.

У школе маладога лектара ўкараняюцца найбольш эфектыўныя формы навучання і выхавання. Разам з лекцыямі праводзяцца семінарскія і практычныя заняткі, дыспуты, калёквіумы, канферэнцыі. У прыватнасці, штогод у красавіку праходзіць агульнаўніверсітэцкая навукова-практычная канферэнцыя слухачоў школы маладога лектара, якая прысвячаецца дню нараджэння У. І. Леніна.

За апошні час школа актывізавала сваю работу. Аб гэтым гавораць наступныя даныя: калі ў 1975-76 навучальным годзе слухачамі школы (55 чалавек) было прачытана 62 лекцыі, то ў 1980-81 навучальным годзе 228 слухачоў прачыталі 496 лекцый.

Разам з тым у рабоце школы існуе шмат недахопаў. Самы сур'ёзны — школа маладога лектара пакуль не можа па-сапраўднаму вырашаць задачы падрыхтоўкі лектарскіх кадраў. Вельмі нязначны працэнт студэнтаў (па 10—20 чалавек ад факультэта) вучыцца цяпер у ШМЛ, большасць выпускнікоў школы пасля заканчэння універсітэта застаюцца ў баку ад лекцыйнай прапаганды там, куды яны накіраваны на работу па размеркаванню.

У чым прычына такога становішча? Парш за ўсё—у няправільным камплектаванні саставу слухачоў школы. На жаль, да сённяшняга дня не выключэннем, а правілам з'яўляецца залічэнне ў школу студэнтаў-першакурснікаў. Няведанне магчымасцей будучых «Цыцэронаў» заканчваецца іх пасіўнасцю ў авалодванні цяжкім аратарскім майстэрствам.

Далей, узровень падрыхтоўкі слухачоў ШМЛ да практычнай работы залежыць ад саставу кіраўнікоў секцый, якія вядуць практычныя заняткі, ад іх майстэрства, вопыту, умення прывіць любоў да сваёй другой прафесіі. Усё яшчэ ёсць выпадкі зрываў семінарскіх заняткаў, правядзення іх ад выпадку да выпадку.

У мэтах павышэння эфектыўнасці работы школы маладога лектара неабходна ўдасканаліць набор яе слухачоў. Пакуль гэтым займаюцца толькі факультэцкія камітэты камсамола. На маю думку, лепш было б, каб гэтым займаліся камітэты камсамола разам з выкладчыкамі кафедр грамадскіх навук, пярвічнымі арганізацыямі таварыства «Веды».

Усё гэта, бясспрэчна, будзе садзейнічаць таму, каб школа маладога лектара з'ўлялася школай грамадзянскага і прафесійнага станаўлення пачынаючых лектараў.

**А. КОТАЎ,**
**старшыня савета школы маладога лектара.**

● МЫ — ШЭФЫ

# Педатрады павінны дзейнічаць

НА ПРАЦЯГУ ШЭРАГУ гадоў камсамольская арганізацыя універсітэта шэфствуе над школамі №№ 12, 39, 60, 80, 83. Створаны камсамольскія педагагічныя атрады, у рабоце якіх толькі ў мінулым годзе прымала ўдзел каля 200 студэнтаў. Добра папрацавалі ў СШ № 12 педатрады механіка-матэматычнага факультэта (адказная Валянціна Вышынская), факультэта радыёфізікі і электронікі (адказны Анатоль Церахаў), у СШ № 83 — фізічнага факультэта (адказны Іван Бабко), а педатрад філалагічнага факультэта, які працуе ў СШ № 80, па праву лічыцца адным з лепшых у раёне.

Аднак хапае ў нашай справе і праблем, на якіх мне хацелася б спыніцца. Перш за ўсё, гэта пытанне арганізацыі педагагічных атрадаў. На многіх факультэтах шэфскай рабоце ўдзяляюць мала ўвагі, у атрады запісваюць у асноўным студэнтаў малодшых курсаў, адсюль — вялікая цякучасць: састаў многіх педатрадаў у мінулым годзе змяніўся больш чым напалавіну, а гэта вядзе к таму, што знікаюць, ледзь нарадзіўшыся, традыцыі, няма спадчыннасці, адсутнічае вопыт педагагічнай работы. У сувязі з гэтым арганізацыйны перыяд зацягваецца на недаравальна доўгія тэрміны. Недахопам з'яўляецца таксама абмежаванасць нашай работы ў рамках школы. Вось характэрны прыклад: у мінулым годзе ў школах было прачытана 205 лекцый пра БДУ, а куды больш эфектыўным было б правядзенне экскурсій па кафедрах, лабараторыях і музеях універсітэта.

Назапашаны вопыт шэфскай работы, той шырокі размах, які яна набывае, дазваляе перайсці на якасна новы ўзровень: ажыццявіць калектыўнае шэфства над школамі. Пакуль што, на жаль, камітэты камсамола факультэтаў слаба звязаны з камсамольскімі арганізацыямі школ. Рэдка праводзяцца сумесныя мерапрыемствы студэнтаў і старшакласнікаў, ды і зводзяцца яны ў асноўным да дыскатэк і некалькіх вечароў працоўнай славы. А калі па-сапраўднаму зацікавіць школьнікаў жыццём універсітэта, прабудзіць у іх цікавасць да навукі, культуры нашай рэспублікі, тады ўжо ў недалёкім будучым нашы факультэты папоўняцца актыўнымі, неабыякавымі студэнтамі. Вялікую дапамогу ў гэтым змогуць аказаць працоўныя атрады старшакласнікаў. Мы ўжо маем вопыт арганізацыі такіх атрадаў на факультэтах радыёфізікі і электронікі, прыкладной матэматыкі, але цяпер гэта работа чамусьці запушчана і не знаходзіць ніякай падтрымкі.

У гэтым годзе, па ўзгадненню з камітэтам камсамола супрацоўнікаў, у нашы падшэфныя школы былі накіраваны групы студэнтаў усіх факультэтаў для арганізацыі гурткоў па свайму профілю, правядзення прафарыентацыйнай работы, прапаганды дасягненняў універсітэта. Кіраўніцтва і метадычную падрыхтоўку гэтых груп узяў на сябе шэфскі сектар камітэта камсамола супрацоўнікаў. Аднак арганізаваць работу гэтых груп мы не змаглі, таму што ніякай дапамогі, ніякага кіраўніцтва з боку шэфскага сектара супрацоўнікаў няма. Навошта тады ствараць гэтыя групы?..

XIX з'езд ВЛКСМ паставіў задачу стварэння і ўмацавання ў кожнай школе педагагічнага атрада. Каб выканаць яе, камсамольскім арганізацыям факультэтаў неабходна звярнуць сур'ёзную ўвагу на шэфскую работу, укамплектаваць педатрады надзейнымі кадрамі. А рэзервы для гэтага ёсць: на многіх факультэтах існуюць педагагічныя патокі. Далейшы лёс тых, хто на іх вучыцца, будзе звязаны са школай, таму работа ў педатрадзе вельмі карысная для такіх студэнтаў, яна дае ім неабходныя практычныя навыкі работы з дзецьмі. Кожны студэнт — будучы настаўнік — павінен прайсці праз школу шэфскай работы. Іменна такая мэта пастаўлена перад камсамольскімі арганізацыямі факультэтаў на пленуме камітэта камсамола універсітэта. Сённяшняя дзейнасць шэфскіх сектараў, іх імкненне працаваць плённа дае надзею, што лепшыя традыцыі нашых педатрадаў захаваюцца, а недахопы і пралікі будуць пераадолены.

**В. МАЛАФЕЕЎ,**
**камісар зводнага педатрада універсітэта.**

# У друкарні БДУ

**ФОТАРЭПАРТАЖ В. ШАЧАКА**

*АДНА са старэйшых работніц друкарні БДУ Ніна Фёдараўна Алькіна праводзіць мяне па цэхах. Калектыў невялікі, але друкарня поўнасцю забяспечвае патрэбы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Я і не ведаў, што мая залікоўка, студэнцкі білет, экзаменацыйныя лісты ў кожную сесію — прадукцыя друкарні БДУ. Гэта прадпрыемства выконвае, акрамя таго, заказы амаль 150 арганізацый і прадпрыемстваў Мінска.*



*НА ЗДЫМКАХ: Ніна Федараўна АЛЬКІНА з наборшчыцамі Янінай Вашкевіч, Тацянай Ціўнчык; дырэктар друкарні Вячаслаў Мікітавіч ШКУРДЗЮК і друкар Валянцін Канстанцінавіч АНДРУШЭНКА абмяркоўваюць выпуск гатовай прадукцыі.*

*Фота В. ШАЧАКА.*



**Сканструяваць і надзяліць пачуццямі робата — ці пад сілу гэта звычайнаму студэнту? Будучыя радыёфізікі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна лічаць, што — так. Робататэхніка — адна са спецыяльнасцей, якой яны авалодваюць на кафедры кібернетыкі.**

СТУДЭНТ І НТП

# Пад знакам «Робата»

### КАФЕДРА

«Каштоўная ўласцівасць робатаў — уменне выконваць пэўныя заданні лепей, хутчэй і больш дасканала, чым чалавек... Гавораць, што кібернетыка нарадзілася «пад знакам робата...» — гэтыя радкі з кнігі В. В. Мацкевіча «Займальная анатомія робатаў» паслужылі своеасаблівай прадмовай да гутаркі з загадчыкам кафедры кібернетыкі А. С. Міхалёвым. Наша сустрэча з ім адбылася пасля прыезду Аляксандра Сяргеевіча з Ленінграда, дзе праходзіла міжнародная выстаўка «Прамысловыя робаты-82». Вучоны ўсё яшчэ знаходзіўся пад яе ўражаннем, паказваў шмат маляўнічых плакатаў, фотаздымкаў, буклетаў аб экспанатах выстаўкі, дзяліўся сваімі думкамі:

— Без памочнікаў - робатаў кіраваць сучаснай тэхнікай проста немагчыма. Але цяперашнія прамысловыя робаты нас ужо не задавальняюць. Іх можна параўнаць з чалавекам, у якога завязаны вочы і «адключаны» слых. Многія навуковыя ўстановы свету займаюцца распрацоўкай робатаў другога і трэцяга пакаленняў, якія павінны мець так званы «штучны інтэлект». Вельмі добра, што і ў Белдзяржуніверсітэце, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, знайшлі магчымасць увесці спецыялізацыю па сістэмах ажыўлення механізмаў і кіравання імі. Вялікая заслуга ў гэтым добрым пачынанні належыць рэктару універсітэта У. А. Беламу, дэкану факультэта радыёфізікі і электронікі А. М. Шырокаву.

...Падмурак новай кафедры быў закладзены ў мінулым годзе, калі універсітэт набыў комплекс сродкаў падрыхтоўкі даных для ЭВМ і першы прамысловы робат «Марс-1» — усяго абсталявання і прылад на 300 тысяч рублёў.

### КІРАЎНІК

Прафесар, доктар тэхнічных навук, член навукова-каардынацыйнага савета Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР А. С. Міхалёў прысвяціў робататэхніцы шмат гадоў свайго жыцця. Дагэтуль працаваў ва Уладзівастоку, а калі яму прапанавалі ўзначаліць новую кафедру ў БДУ імя У. І. Леніна, прыехаў у Мінск. Аляксандр Сяргеевіч апантаны любімай справай, горача імкнецца рэалізаваць усе свае навуковыя ідэі.

— Беларусь — рэспубліка вельмі перспектыўная ў адносінах робатабудавання,— пераканаиы А. С. Міхалёў.— Распрацоўкай і ўкараненнем прамысловых робатаў займаецца ў нас навукова-вытворчае аб'яднанне «Гранат».

Новая кафедра існуе менш чым год, але ўжо актыўна ўключылася ў навуковую работу. Заключаны дагавор з навукова - вытворчым аб'яднаннем парашковай металургіі на распрацоўку выканаўчых назіральных сістэм робата для плазменнага напылення металічных парашкоў. На чарзе — заключэнне дагавора з НВА «Гранат» па распрацоўцы электрамеханічных выканаўчых падсістэм прамысловых робатаў.

Як бачым, задачы перад навуковым калектывам кафедры стаяць вялікія і адказныя. І ажыццяўляць іх самым актыўным чынам дапамагаюць студэнты.

### «МЫ КАНСТРУІРУЕМ...»

Вельмі папулярная ў будучых радыёфізікаў сцэнка, якую паказалі на канцэрце мастацкай самадзейнасці факультэта два сябры-трэцякурснікі. Адзін з іх быў Канструктарам, другі — Робатам, які пасля шматлікіх намаганняў свайго «стваральніка» авалодаў уменнем... вастрыць нажы. Гэты трапны жарт выклікаў добрыя ўсмешкі.

Размеркаванне па кафедрах на факультэце радыёфізікі і электронікі адбываецца на трэцім курсе. І, вядома, вялікая колькасць хлопцаў і дзяўчат цяпер жадае трапіць менавіта на кафедру кібернетыкі.

— Новае і невядомае заўсёды захапляе,— тлумачыць гэты кібернетычны «бум» стараста групы па робататэхніцы Валерый Седач.— А калі новае такая цікавая і патрэбная ў наш час спецыяльнасць,— захапленне ўзрастае ўдвая.

...Звычайная, на першы погляд, студэнцкая група з шасці юнакоў: Валодзя Жаўрыд, Ігар Касцюк, Сяргей Шымановіч, Валодзя Худалей, Віталь Кузьмянкоў, Стас Гендэль... І — не вельмі звычайная. Бо яны — «першапачынальнікі». А гэта заўсёды і ганарова, і вельмі адказна.

Выхаванцы іншых кафедраў жартаўліва называюць іх «робатамі». Але хлопцы не крыўдзяцца: добра было б, каб калі-небудзь іх паслядоўнікі і сапраўды сканструявалі такіх дапытлівых робатаў!

...Тых, хто сёння ўважліва канспектуе лекцыі па робататэхніцы, займаецца ў лабараторыях на пятым паверсе будынка радыёфізічнага факультэта БДУ, праз тры гады чакаюць навукова-даследчыя інстытуты, канструктарскія бюро, навукова-вытворчыя аб'яднанні, занятыя распрацоўкай робататэхнічных сістэм і комплексаў. І, магчыма, праз некальні гадоў яны будуць жартаваць, што нарадзіліся не пад знакам Казерога, Вадалея, Блізнят або яшчэ якога звычайнага сузор'я, а пад знакам «Робата». І ў гэтым жарце будзе свая доля ісціны...

**Н. ШЧАЛКАНОГАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

# НІ ПУХУ, НІ ПЕР'Я!

**ЖАДАЕ ЛІРЫЧНА-ІРАНІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ УСІМ СТУДЭНТАМ І ВЫКЛАДЧЫКАМ**



*— І гэта ўсё, чаму я цябе навучыў за семестр?..*



*Без слоў...*




### РОБЕРТ БЕРНС

— Кто там стучится
в поздний час?
«Конечно, я, Финдлей!»
— С тобой встречаюсь
в пятый раз!
«В седьмой»,—
сказал Финдлей.
— Но ты не сдашь ведь
все равно?
«Не сдам»,—
сказал Финдлей.
— Раз в голове твоей
темно...
«Темно»,— сказал Финдлей.
— Небось девчонки на уме?
«Угу»,—
сказал Финдлей.
— Тебя же выгонят к весне.
«Должны»,— сказал
Финдлей.
— Пасти свиней
пойдешь опять?
«Пойду»,—
сказал Финдлей.
— Весь день на дудочке
играть?
«Весь день»,—
вздохнул Финдлей.
— А ты, приятель,
не дурак? —
«Ну нет»,—
вскипел Финдлей.
— Зайдёшь ещё раз,
или как?
«Зайду»,—
вскричал Финдлей.

# ПРА СЕСІЮ...

### АНДРЕЙ ВОЗНЕСЕНСКИЙ

Стряхните страхи
с лица,
неряхи, пора!
Экзамены на знамени —
Ура? Ура!
Тропа в аудитории —
тела, тела...
А Светка-то историю
сдала, сдала!
Тонет Стёпка —
стоп — кадр:
(профессор,
я выучу
к следующей
зимне-весенней,
летне-осенней
экзаменационной
сессии).
У Гонина агония,
глаза — квадрат,
уши — треугольники —
дегенерат.
(Я получил
«неудовлетворитель»,
вы представляете,
Вознесенский?)
— Это расплата, Оза,
за трансплантацию
мозга.
На сковородке времени
мессия, я и месиво,
Я временный
поверенный,
Я — сессия... Сессия!

### РОБЕРТ РОЖДЕСТВЕНСКИЙ

На дверях табличка
«Экзамены» —
Всем понятно,
какой предмет.
Двух отличников
вынесли замертво,
А у третьего —
начался бред.
Спотыкаемся мы
на выводе
Удивительно длинной
формулы,
У физички глаза
навыкате.
Но она в преотличной
форме,
В ее голосе всё
обманчиво.
В её голосе всё
подделочка:
«Ни черта вы не знаете,
мальчики,
Ни черта вы не знаете,
девочки,
Где же ваша, простите,
логика?
Вы живёте одними
курсивами».
Перебил ее Петька
Логинов:
красивая!»
...Мы зачетками
в столик тычемся.
Мы уходим с довольным
ропотом...
Тяжело вам будет
в двухтысячном
Сдавать экзамены
роботам!





*Дагуляўся...*



*— Бывай, родны. Сустрэнемся пасля сесіі...*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
20 студзеня 1983 г.
Зак. 120. АТ 00027

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ